**2024 г. - 35 гадоў з часу заснавання філіяла «Будтрэст № 33» адкрытага акцыянернага таварыства «Будаўнічы трэст № 8» (Кобрын; 1989)**

Філіял «Будтрэст № 33» адкрытага акцыянернага таварыства «Будаўнічы трэст № 8» - адзін з флагманаў будаўнічай галіны Кобрынскага раёна, вядучая будаўнічая арганізацыя ў Кобрынскім рэгіёне – бярэ свой пачатак з 1989 года. Загадам Міністэрства будаўніцтва БССР ад 10 лістапада 1989 года № 157 «Аб стварэнні будаўніча-мантажнага трэста ў г. Кобрыне Брэсцкай вобласці» быў створаны будаўніча-мантажны трэст № 33. Першым кіраўніком трэста прызначаны Мікалай Васільевіч Кожух.

Праект прадугледжваў аб’яднанне пад адным дахам галоўных будаўнічых арганізацый горада: райсельбуда, ПМК 44, БУ-182 і былую ПМК-70 з тым, каб не распыляць іх сілы і сродкі, а разам вырашаць будаўнічыя праблемы горада. Аднак пры гэтым не ўлічылі тое, што ўсе вышэйназваныя арганізацыі адносяцца да розных ведамстваў, і пераадолець гэты бар’ер аказалася немагчыма.

У наступныя гады структура трэста змянялася і аптымізавалася. У 1990-я гады арганізацыя перажыла не адно скарачэнне і ўзбуйненне. 31 кастрычніка 1994 года ў адпаведнасці з законам аб прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці ў Рэспубліцы Беларусь дзяржаўнае прадпрыемства «Будаўніча-мантажны трэст № 33» пераўтвораны ў адкрытае акцыянернае таварыства «Будаўнічы трэст № 33». З 1992 года па 1997 год будаўнічая галіна перажывала цяжкія часы, але, нягледзячы на складанасці, трэст у гэты перыяд пабудаваў шэраг аб’ектаў вытворчага і сацыяльна-культурнага прызначэння.

У 2013 годзе ў адпаведнасці з рашэннем калегіі Мінбудархітэктуры ад 16 ліпеня 2013 года № 309 «Аб рэарганізацыі акцыянерных таварыстваў» трэст быў рэарганізаваны шляхам далучэння і пераўтвораны ў філіял «Будтрэст № 33» ААТ «Будаўнічы трэст № 8» (Брэст).

«Будтрэст № 33» - структурнае падраздзяленне ААТ «Будаўнічы трэст № 8», якое выконвае шырокі спектр работ у сферы будаўніцтва. Асноўны від дзейнасці філіяла - будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнага і грамадзянскага

прызначэння. Узводзяць будынкі і аб'екты ў асноўным на тэрыторыі Кобрынскага раёна. Акрамя асноўнай дзейнасці прадпрыемства вырабляе таварны раствор і бетон, металаканструкцыі і інш. Маючы ўласную вытворчасць, рыхтуе вырабы са зборнага бетону і жалезабетону, што значна паскарае тэрмін узвядзення будынкаў, аб'ектаў. Дзякуючы ўласнаму аўтапарку са спецыяльнай будаўнічай тэхнікай, абсталяваннем, укамплектаванай матэрыяльна-тэхнічнай базай, а таксама штату прафесіяналаў з дастойным вопытам у прафесіі, будтрэст выконвае задачы аператыўна і якасна.

У спісе трэста – цэлы шэраг самых розных аб’ектаў. Кобрынскія будаўнікі працавалі ва ўсіх гарадах вобласці, дзе праводзіліся абласныя фестывалі-кірмашы «Дажынкі», працавалі на будаўніцтве атамнай станцыі ў Астраўцы. Вялікі аб'ём работ выконваецца ў Брэсце, асноўная частка якога - будаўніцтва жылля. З сацыяльных аб'ектаў у абласным цэнтры былі ўзведзены школа і анкалагічны дыспансер, адрамантаваны дзіцячая паліклініка, стадыён «Дынама» і інш. Самым буйным аб'ектам, які зараз будуе арганізацыя, з'яўляецца комплекс памежнай заставы ў вёсцы Макраны Маларыцкага раёна, кошт якога складае каля 180 млн. рублёў.

Філіял «Будтрэст № 33» прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы Кобрына да рэспубліканскага фестывалю-кірмашу «Дажынкі-2009». Палац культуры, амфітэатр, аквапарк, рэканструкцыя парка імя А. В. Суворава – усё гэта ўзведзена будаўнікамі трэста.

За апошнія гады рэалізаваны такія праекты, як: рэканструкцыя будынкаў Кобрынскага псіханеўралагічнага дыспансера, забудова мікрараёна па вуліцы Дзяржынскага, будаўніцтва камунікацый, жылога дома і добраўпарадкаванне ў мікрараёне па вуліцы Дружбы, будаўніцтва памежнай мабільнай заставы ў аграгарадку Дзівін Кобрынскага раёна, будаўніцтва жылых дамоў у рамках праграмы развіцця і адраджэння вёскі і іншыя аб'екты. Важнае месца ў рабоце філіяла займае будаўніцтва сельскагаспадарчых аб'ектаў у Кобрынскім раёне. Так, уведзены ў эксплуатацыю малочнатаварныя фермы ў вёсках Корчыцы, Лука, Мінянка, ферма на 630 галоў дойнага статка ў вёсцы Падбер'е і інш.

На сённяшні дзень арганізацыя займаецца падрыхтоўкай пляцоўкі пад новы мікрараён па вуліцы Мікалаева, будаўніцтва шматпавярховых дамоў у якім пачнецца ў

бліжэйшы час, рамонтам дваровых тэрыторый, рэканструкцыяй і рамантам сельскагаспадарчых і сацыяльных аб'ектаў.

Сёння на прадпрыемстве працуюць каля 300 чалавек, кожны з якіх у поўнай меры ўсведамляе значнасць сваёй працы для горада і краіны. Побач з шматгадовым багатым вопытам ветэранаў працуе вялікая колькасць моладзі. Прафесіяналізм кобрынскіх будаўнікоў неаднаразова пацвярджаўся жыццём на самых розных узроўнях, атрымлівае заслужанае прызнанне на ўсіх аб’ектах.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2024 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф I катэгорыі аддзела абслугоўвання і інфармацыі

**Филиал** «Стройтрест № 33» ОАО «Строительный трест № 8» // Мы строим Брестчину. – Брест, 2019. – С. 298-299 : фот.

**Климчук Николай Александрович** : [зам управляющего Стройтреста № 33 г. Кобрина] // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Деловой мир СНГ. - Минск, 2006. – Вып. 3. - С. 171 : фот.

**Кожух Николай Васильевич** : [генеральный директор Стройтреста № 33 г. Кобрина (1989-1998), председатель городского Совета депутатов] // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Деловой мир СНГ. - Минск, 2006. – Вып. 3. - С. 176.

**Філіялу** «Будтрэст № 33» адкрытага акцыянернага таварыства «Будаўнічы трэст № 8» (1989) - 35 гадоў // Зводны каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021-2025 гг. / Кобрынская РЦБС, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 140.

**Белов, Д.** В Кобрин пришел монолит / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2024. – 10 жніўня (№ 32). – С. 13 : фот.

Одним из флагманов строительной отрасли - филиалом «Стройтрест № 33» ОАО «Строительный трест № 8» - по новой технологии возводится многоэтажка в микрорайоне 3.5.

**Белов, Д.** Научился всему и сам построил дом / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2024. – 10 жніўня (№ 32). – С. 13 : фот.

Плиточник-облицовщик, фасадчик филиала «Стройтрест № 33» ОАО «Строительный трест № 8» Александр Белянов за высокие трудовые достижения в строительстве значимых социальных объектов удостоен Благодарственного письма Брестского облисполкома.

**Белов, Д.** Призвание — созидать / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 4 лютага (№ 9). — С. 1, 8 : фот.

О работе начальника участка филиала "Стройтрест № 33" ОАО "Строительный трест № 8" Владимира Евсеева.

**Белов, Д.** Созидание во имя будущего / Дмитрий Белов ; фото: Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2023. — 12 жніўня (№ 54). — С. 4 : фот.

О работе филиала "Стройтрест № 33" ОАО "Строительный трест № 8" по рассказу директора Аркадия Замковича.

**Белов, Д**. Профессия — созидать! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. — 7 жніўня (№ 62). — С. 4 : фот.

О строительной отрасли Кобринщины и работе филиала "Стройтрест № 33" ОАО "Стройтрест № 8".

**Бакун, А.** Сціпласць працы не перашкода / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 11 жніўня. — С. 4.

Пра вадзіцеля філіяла “Будтрэст № 33” А. Угляніцу.

**Бялоў, Д.** Горад будуе — горад жыве! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2018. — 11 жніўня. — С. 4.

**Белов, Д.** Профессия - созидать / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2014. — 9 жніўня. — С. 1, 2.

Филиал "Стройтрест № 33" ОАО "Стройтрест № 8"ведет строительство двух домов в городе с опережением графика.

**Бялоў, Дз**. Жыллё - па дзяржаўным заказе / Дзмітрый Бялоў ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2014. — 22 сакавіка. — С. 2.

Будтрэст № 33 будуе жылы 60-кватэрны дом у новым мікрараёне па вуліцы Дзяржынскага.

**Пашкович, Л.** Аркадий Замкович: «Горжусь каждым объектом» // Кобрынскі веснік. – 2014. – 3 снежня. – С. 3.

Филиал «Стройтрест № 33» ОАО «Стройтрест № 8» в ноябре отметил своё 25-летие.

**Белов, Д.** Преобразующая сила зодчих / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. — 2013. — 10 жніўня.— С. 4, 8-9.

На счету специалистов ведущей строительной организации ОАО «Стройтрест № 33» такие объекты, как амфитеатр, плавательный бассейн, аквапарк, Дворец культуры, здания архива, школы искусств и многие другие.

**Девяткова, С.** Были бы объемы... / Светлана Девяткова // Народная газета. - 2012. - 6 лістапада. - С. 5.

ОАО «Стройтрест № 33» считается одним из лучших в Кобрине.

**Замковіч, А.** Ад аграгарадкоў - да атамных станцый / Аркадзь Замковіч, запісаў Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012. - 21 красавіка. - С. 2.

Будтрэст № 33 г. Кобрына выходзіць на міжнародны рынак.

**Петроченко, А.** Балтийский подряд / Анна Петроченко // Вечерний Брест. - 2012. - 10 августа. - С. 3.

ОАО «Стройтрест № 33» г. Кобрина работает в Калининградской области на возведении комбикормового завода.

**Замковіч, А**. "Будуем на доўгія гады, каб нашчадкі сказалі "дзякуй!" : [ААТ "Будаўнічы трэст № 33] / Аркадзь Замковіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 16 ліпеня. - С. 9.

**Замковіч, А**. Працаваць хутка, будаваць якасна / Аркадзь Замковіч ; [гутарыў] Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2010. - 29 снежня. - С. 2.

Аб здабытках і планах на будучае расказаў генеральны дырэктар будтрэста № 33 А. Замковіч.

**Мельнік, Р.** Цяпер - па еўрастандартах : [ААТ "Будаўнічы трэст № 33] / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2010. – 17 ліпеня. - С. 3.

**Белов, Д**. ОАО «Стройтрест № 33» : строим на века! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2009. - 11 лістапада. - С. 2-3.

**Пянко, А.** ОАО "Строительный трест № 33": Размах работ впечатляет / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2008. – 9 августа. - С. 2.

**Чернушенко, В.** Кто строит, у того есть будущее : [ОАО "Строительный трест № 33"] / Виктор Чернушенко // Народная газета. - 2008. - 29 ліпеня. - С. 6.

**Пянко, А.** Трестовский почерк : [ОАО "Строительный трест № 33"] / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. – 11 жніўня. - С. 2.

**Янович, Н.** Новым кобринским квартирам - автономное отопление : [ОАО "Строительный трест № 33"] / Нина Янович // Народная газета. - 2007. - 19 ліпеня. - С. 12.

**Дожук, Н.** Ответственная миссия – созидать : [ОАО "Строительный трест № 33"] / Н. Довжук // Кобрынскі веснік. – 2006. – 12 жніўня. – С. 2.

**Пянко, А**. Фактор ускорения : [ОАО "Строительный трест № 33"] / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2006. – 17 чэрвеня. – С. 2.

**Пянко, А**. У треста хороший потенциал : [ОАО "Строительный трест № 33"] / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2005. - 12 сакавіка. – С. 3.

**Савчук, М.** Самые красивые здания Кобрина – дело рук строителей 33-го треста / М. Савчук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 18 августа. – С. 2.

**Максимчик, А.** Сильный пойдет в гору : [ОАО "Строительный трест № 33"] / А. Максимчик // Кобрынскі веснік. – 2003. – 18 чэрвеня. – С. 2.

**Пянко, А.** На память города дарить : [Строительный трест № 33] / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 2003. – 15 кастрычніка. – С. 3.

**Кожух, М**. Шлях выжывання : [Будтрэст № 33] / М. Кожух // Кобрынскі веснік. – 1996. - 10 жніўня. – С. 2.

**Кожух, М. В**. Трэст жыве і працуе : [Будтрэст № 33] / М. В. Кожух // Кобрынскі веснік. – 1993. – 7 жніўня. – С. 3.

**Васюк, Н.** Хто ў горадзе будаўнік? : [Будтрэст № 33] / Н. Васюк // Кобрынскі веснік. – 1991. – 3 жніўня. – С. 2.

**Нам** здесь строить и жить : [Строительно-монтажный трест № 33] // Заря. – 1991. – 14 марта.

**Леонович, А.** Здесь ждут переселенцев / А. Леоновец // Советская Белоруссия. – 1990. – 16 февраля.

О создании в Кобрине стройтреста № 33.

**Кобрынскі раён**
**Кобрын**
**Кобрынскі будаўнічы трэст № 33**
**Будаўнічыя арганізацыі**